PATVIRTINTA
Nacionalinio egzaminų centro direktoriaus
2011 m. vasario 10 d. įsakymu Nr. (1.3.)-V1-11

Gimtosios kalbos (baltarusių) dalies žodžiu (viešojo kalbėjimo) pagrindinio ugdymo pasiekimų patikrinimo vertinimo instrukcija (lentelė)

I. Першы этап – планаванне выступлення.

На гэтым этапе вучань выбірае / фармулюе тэму, даследуе розныя крыніцы інфармацыі, складае разгорнуты план выступлення са спіскам крыніц інфармацыі, якія ён будзе выкарыстоўваць пры адказе.

Крытэрыі	Апісанне крытэрыяў	Ацэнка	Балы (3)
1. Змест	Дэманструецца ўменне сфармуляваць / выбраць тэму, аформіць магчымыя тэзісы (2–3), абгрунтаваць не менш за 2 аргументы з указаннем крыніц інфармацыі.	Адпавядае крытэрыям	**2**
		Часткова	**1**
		Не	**0**
2. Структура тэксту	Паказваецца разгорнуты план выступлення.	Так	**1**
		Не	**0**
3. Кантакт з адрасатам	–		**–**
4. Правільнасць і выразнасць мовы	–		**–**

II. Другі этап – напісанне тэксту выступлення.

З улікам заўваг настаўніка вучань дапрацоўвае план, вывучае складзены спіс літаратуры, рыхтуе разгорнуты тэкст выступлення. Пры неабходнасці вучань спасылаецца на наглядны матэрыял, які плануе выкарыстаць і які працягвае збіраць, і дае тэкст для праверкі.

Крытэрыі	Апісанне крытэрыяў	Ацэнка	Балы (8)
1. Змест	У тэксце выразна выказаны асноўная думка, тэзісы і аргументы «за» (пры неабходнасці і “супраць”). Выкарыстоўваюцца розныя крыніцы інфармацыі.	Адпавядае крытэрыям	**2**
		Часткова	**1**
		Не	**0**
	Дэманструецца ўменне самастойна разважаць, абагульняць / рабіць высновы.	Адпавядае крытэрыям	**2**
		Часткова	**1**
		Не	**0**
2. Структура тэксту	Прысутнічаюць усе структурныя часткі (уступ, асноўная частка, заключэнне), вытрыманы іх прапорцыі. Удала выкарыстоўваюцца цытаты / прыклады і сродкі сувязі. Структура сказаў успрымаецца на слых.	Адпавядае крытэрыям	**2**
		Часткова	**1**
		Не	**0**
3. Кантакт з адрасатам	Дэманструецца ўменне карыстацца рытарычнымі стратэгіямі / зацікавіць адрасата (арыгінальны пачатак, самы важкі аргумент ў канцы выступлення, кантраст, цытаты, крылатыя выразы, рытарычныя пытанні і г.д.).	Адпавядае крытэрыям	**1**
		Не	**0**
4. Правільнасць і выразнасць мовы	Мова граматная, адпавядае нормам літаратурнай мовы.	Адпавядае крытэрыям	**1**
		Не	**0**

III. Трэці этап – выступленне.

Азнаёміўшыся з каментарыямі настаўніка, вучань удасканальвае выступленне, завучвае яго і прамаўляе.

Крытэрыі	Апісанне крытэрыяў	Ацэнка	Балы (9)
1. Змест	Дэманструецца ўменне выказаць свае адносіны да прадмету выступлення і пры неабходнасці карыстацца наглядным матэрыялам.	Адпавядае крытэрыям	**2**
		Часткова	**1**
		Не	**0**
	Мова лагічная, паслядоўная, выкарыстоўваюцца сродкі для структурызацыі тэксту: па-першае і інш.	Адпавядае крытэрыям	**1**
		Не	**0**
2. Структура тэксту	Дэманструецца ўменне ўстанавіць зрокавы кантакт з адрасатам і імкненне яго зацікавіць. Жэсты і міміка адпавядаюць камунікатыўнай сітуацыі.	Адпавядае крытэрыям	**2**
		Часткова	**1**
		Не	**0**
3. Кантакт з адрасатам	У мо е в амаль адсутнічаюць лексічныя, граматычныя, стылістычныя і арфаэпічныя памылкі.	Адпавядае крытэрыям	**2**
		Часткова	**1**
		Не	**0**
4. Правільнасць і выразнасць мовы	Мова багатая і выразная, удала ўжываюцца выяўленчыя сродкі мовы, сінонімы, антонімы і інш.	Адпавядае крытэрыям	**2**
		Часткова	**1**
		Не	**0**